ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 25 (1251) ● 20 верасня 1979 г. Цана 2 кап.



# У ВЯЛІКУЮ НАВУКУ, У ВЯЛІКАЕ ЖЫЦЦЁ

## РЭПАРТАЖ З ПАСВЯЧЭННЯ ПЕРШАКУРСНІКАЎ У СТУДЭНТЫ



Цёплы вераснёўскі дзень. Яркае сонца грэе і свеціць яшчэ па летняму шчодра, нават зелень не кранута блізкай восенню.

Мінск. Колькі яму гадоў? Бясстрасныя летапісцы могуць адказаць на гэта са строгай дакладнасцю. А вось, калі пахадзіць па вуліцах горада, убачыш, што маняць і летапісцы. Горад выглядае на 30—35 гадоў. А ёсць час, калі ён выглядае яшчэ маладзей.

Гэта бывае 1 верасня, калі дзесяткамі дарог вяртаецца да яго маладосць. У гэты дзень горад скідвае са сваіх плячэй яшчэ некалькі гадоў. Бадзёры, жыццярадасны, ён сам, здаецца, з ахвотай узяў бы ў рукі канспект і пайшоў у аўдыторыю.

Скончылася ўжо гарачая пара ўступных экзаменаў... Колькі бяссонных начэй мінула, перш чым той, хто цяпер называецца першакурснікам, знайшоў сваё прозвішча ў спісу залічаных у ВНУ.

Сёння, праз некалькі хвілін, адбудзецца ўрачыстае пасвячэнне першакурснікаў у студэнты. На універсітэцкім двары мнагалюдна, усюды пануе ажыўленне. Музыка. На тварах святочнае ўзрушанне і ўсмешкі.

— Вось яна, мара,— побач,— так думаецца Тамары Пранчак, будучай настаўніцы. І не толькі ёй. Такія ж радасныя, светлыя думкі поўняць і сяброўак. Ганну Лысакоўскую і Лену Прыстром, якія паступілі на механіка-матэматычны факультэт універсітэта. Дзяўчаты прыехалі са Смалявіч, школу закончылі з залатым медалём.

...15 гадзін дня. Сціхаюць фанфары.

— Да ўносу сцяга БДУ імя У. І. Леніна, сцяга камсамольскай арганізацыі універсітэта, ганаровых сцягоў, заваёваных студэнтамі універсітэта ў вучобе і працы, смірна! Раўненне на сцягі!

Чырвоныя палотнішчы праплылі над галовамі першакурснікаў. Аркестр іграе марш. Затым сакратар камітэта камсамола П. І. Брыгадзін дакладвае прарэктару па вучэбнай рабоце універсітэта У. Р. Івашыну, што для правядзення ўрачыстага рытуала «Пасвячэнне ў студэнты Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна» ўсё падрыхтавана. Гучыць студэнцкі гімн «Гаудэамус».

Прадстаўнікі рэктарата, грамадскіх арганізацый універсітэта знаёмяць юнакоў і дзяўчат з установай, віншуюць з пачаткам новага навучальнага года.

— Дарагія першакурснікі! — гаворыць прафесар У. Р. Івашын. Здзейснілася ваша мара. З гэтага дня асноўным зместам вашага жыцця стане вучоба. А вучоба ў ВНУ — гэта напружаная праца...

Будучыя пяць гадоў вучобы ўяўляюцца вам здзяйсненнем усіх вашых жаданняў, а гэты першы дзень — пачаткам трыумфальнага шэсця па навуцы, пачаткам пяцігадовага падарожжа.

Потым перад першакурснікамі выступілі сакратар парткома, дацэнт М. С. Гарашчук, беларускі паэт, член Саюза пісьменнікаў БССР, прафесар Н. С. Гілевіч, член-карэспандэнт АН БССР, доктар хімічных навук, прафесар І. Р. Цішчанка.

Каля памятнага Знака выкладчыкам і студэнтам універсітэта, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, узвіўся і затрапятаў флаг новага навучальнага года. Яго ўзнялі студэнты-першакурснікі. Да падножжа мемарыяльнага помніка ўскладаюцца кветкі. А праз некалькі хвілін У. Р. Івашын уручае новаму пакаленню студэнтаў сімвалічны ключ ад ведаў.

Гучаць словы ўрачыстай клятвы першакурснікаў.

А потым — віншаванні і наказы выпускнікоў і лепшых байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў:

— Я бачу вашы шчаслівыя твары, — гаворыць студэнт V курса механіка-матэматычнага факультэта, імянны стыпендыят Аляксандр Казулін.— Мне радасна за вас. Прыемна, што такое папаўненне ўліваецца ў нашу сям'ю. Добра вучыцеся, займайцеся спортам, удзельнічайце ў грамадскім жыцці універсітэта. Такое не паўтараецца. Ні пуху вам, ні пер'я!

— Каб быць сапраўдным студэнтам, неабходна пабыць у будатрадзе і на сельгасработах,— працягвае Аляксандр Ракевіч, студэнт V курса геафака.— Я, напрыклад, сёлета працаваў на Пскоўшчыне, раней быў на БАМе. І ў маёй памяці застануцца на ўсё жыццё гэтыя прыемныя ўспаміны. Шчаслівай жа і вам дарогі, гарачыя і неспакойныя сэрцы!

Свята закончылася. Разыходзіліся юнакі і дзяўчаты, якія толькі што адчулі сябе паўнапраўнымі членамі шматтысячнага калектыву. Наперадзе ў кожнага зайздросная пара студэнцтва — пяцігадовы шлях здзяйсненняў і перамог, набыцця ведаў і адкрыцця сябе — гады выпрабаванняў на чалавечнасць, гады гартавання.

Поспехаў жа вам, сябры, на шляху да ведаў!

**Рэпартаж вялі нашы спец. карэспандэнты Н. ЖУКАВА, М. ДУБОВІК (фота).**



## У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

Адбылося чарговае пасяджэнне рэктарата, на якім разгледжана пытанне «Выкананне рашэння Савета універсітэта ад 2 ліпеня 1979 года «Аб задачах універсітэта па падрыхтоўцы да новага навучальнага года». Быў заслуханы даклад прарэктара па вучэбнай рабоце У. Р. Івашына. Да ведама прысутнічаючых рэктарам універсітэта У. А. Белым была даведзена інфармацыя аб дзейнасці рэктарата па матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню вучэбнага працэса і навуковых даследаванняў.

* * *

**Трэцяя Усесаюзная канферэнцыя па аналітычнай хіміі была арганізавана на базе хімфака БДУ. На яе адкрыцці выступілі старшыня навуковага савета па аналітычнай хіміі, акадэмік АН СССР І. П. Алімарын, першы намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, прафесар Ф. М. Капуцкі і іншыя. Работа канферэнцыі працягвалася па секцыях.**

* * *

Па запрашэнню аддзела замежных сувязей у Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна з цыклам лекцый прыехаў адзін са старэйшых прафесараў універсітэта Паўднёвай Фларыды доктар філасофіі ў галіне хіміі Тэадор Ашфорд. Яго першыя лекцыі аб сістэме адукацыі ў ЗША сабралі значную аўдыторыю слухачоў.

* * *

**Азнаямленча-вытворчую практыку ў ГДР праходзяць зараз 6 груп студэнтаў нашага універсітэта. Іенскі універсітэт імя Ф. Шылера прымае фізікаў, гісторыкаў, філолагаў і матэматыкаў. Яшчэ адна група фізікаў і прадстаўнікі біяфака знаходзяцца ва універсітэце імя Марціна Лютэра ў Гале.**

* * *

Спецыяльным выпускам насценгазеты сустрэлі студэнты хімічнага факультэта першакурснікаў. Новаму папаўненню рэдкалегія прадставіла дэкана факультэта і яго намеснікаў, сакратара камітэта камсамола. Фотаздымкі расказваюць аб вучобе і навуковай рабоце на факультэце, аб сельгасработах, нядзельніках, аб студэнцкім самадзейным тэатры.

# ВЕРАСНЁЎСКАМУ ПОЛЮ—

**Ціха ў студэнцкіх аўдыторыях — працягваецца працоўны семестр. З першых дзён восені большасць студэнтаў і выкладчыкаў нашага універсітэта паклікаў ураджай-79. У 61 калгас і саўгас Магілёўшчыны на ўборку бульбы, ільну, гародніны, універсітэт накіраваў больш як чатыры тысячы сваіх выхаванцаў. Звыш 300 чалавек працуюць на нарыхтоўцы кармоў для жывёлы ў Уздзенскім і Крупскім раёнах Мінскай вобласці.**

КАМСАМОЛЬСКІ ТЭЛЕТАЙП

## У напружаным рытме

Вялікую дапамогу аказваюць студэнты біялагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна працаўнікам Чавускага раёна. 8 атрадаў працуе на палетках калгасаў і саўгасаў «Юны камунар», «Свята Кастрычніка», «Ленінскі шлях», «Галавенчыцы» і «Першае мая». Усюды пануе напружаны працоўны рытм.

Гаспадаркі стварылі студэнтам спрыяльныя ўмовы для працы і адпачынку. У першы ж дзень вырашылі пытанне з харчаваннем, размясцілі моладзь па кватэрах, аддалі ў распараджэнне студэнтаў мясцовыя клубы.

**У. КАСЦЮК,**
**сакратар камітэта камсамола біяфака.**

## Трэці семестр працягваецца

Не скончыўся працоўны семестр з першым днём восені і для студэнтаў журфака. Ён працягваецца для іх у саўгасе імя Ф. Смалячкова Быхаўскага раёна. Гаспадарка спецыялізуецца на вырошчванні гародніны. Да прыезду студэнтаў заставалася ўбраць 100 гектараў морквы, 30 гектараў кабачкоў, гуркі, капусту. Адным словам, фронт работы вялікі. Не выпадкова, што толькі ў адным гэтым саўгасе працуе атрад са 130 будучых работнікаў друку.

— Размясціць такую колькасць людзей, стварыць ім спрыяльныя ўмовы працы і адпачынку, вядома ж, складана, — гаворыць дырэктар саўгаса І. Д. Янчанка,—таму ў першыя дні былі некаторыя недахопы.

Дакладней аб праліках гаспадаркі мы даведаліся ад саміх студэнтаў;

— Спачатку не хапала посуду, былі перабоі з дастаўкай прадуктаў харчавання. Цяпер, быццам бы, усё наладжана.

— У брыгадзе Балонаў Сялец студэнты шмат часу губляюць на дарогу да месца работы і назад.

На жаль, як растлумачыў кіраўнік саўгаса, гаспадарка пакуль што не мае магчымасці забяспечыць іх транспартам: усе машыны заняты на іншых работах. Думаецца, і гэта пытанне ў хуткі тэрмін будзе вырашана.

**В. ДУДКО,**
**сакратар камітэта камсамола журфака.**

## Кантрасты падрыхтоўкі

У гэтым годзе, таксама як і ў мінулым, студэнты-хімікі накіраваны на ўборку бульбы ў адзін з самых аддаленых ад Мінска раёнаў Беларусі — Клімавіцкі. Па-рознаму адарыла зямля працу земляробаў раёна. У большасці гаспадарак ураджай высокі — каля 320—340 цэнтнераў бульбы з гектара.

Ужо чакалі памочнікаў у саўгасе «Раднянскі», дзе ў кароткі тэрмін былі вырашаны пытанні быта студэнтаў-першакурснікаў і арганізацыі ўборачнага канвеера. Зусім інакш сустрэлі студэнтаў чацвёртага курса кіраўнікі саўгаса «Малышкавічы»—поўнай адсутнасцю падрыхтоўкі да ўборкі бульбы. Уладкаванне быта праводзілася тут сіламі выкладчыкаў (дацэнта Н. І. Рафальскага і асістэнта А. А. Казыра), якія патрацілі каля тыдня на пошукі прадуктаў, газавага балона, халадзільніка, на размеркаванне студэнтаў па кватэрах. Бульбаўборачны камбайн першы раз выйшаў на поле ў гэтай гаспадарцы толькі праз 6 дзён пасля прыезду студэнтаў. І калі ў адрас кіраўнікоў саўгаса «Раднянскі» можна накіраваць словы ўдзячнасці, то дзеянні кіраўнікоў саўгаса «Малышкавічы» пакуль што выклікаюць нараканні.

**С. РАХМАНАЎ,**
**сакратар камітэта камсамола хімфака.**

## Фізікі—шэфы

455 студэнтаў увайшло ў склад 18 сельскагаспадарчых атрадаў фізфака, якія дыслацыруюцца ў калгасах і саўгасах Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Большасць байцоў ССГА заняты на ўборцы бульбы, але некаторым атрадам знайшлася работа на зернетаках. З першых дзён вытворчая норма студэнтамі выконваецца паспяхова.

Байцы атрада «Фізік-4» (камандзір В. Блішч, камісар Г. Ярашэвіч), якія працуюць у саўгасе «Ямны» ў вольны ад уборачных работ час адрамантавалі мясцовую школу, вядуць значную лектарскую работу, арганізавалі канцэрт мастацкай самадзейнасці.

**У. АДЖАЕЎ,**
**сакратар камітэта камсамола фізфака.**

## КОЖНЫ ДЗЕНЬ—РЭКОРД

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы надвор'я, у калгасе «Нёман» Уздзенскага раёна вырашчаны нядрэнны ўраджай бульбы. І зараз на бульбяных палетках вельмі ажыўлена. Уборка ў разгары. Чуваць напружаны гул матораў: трактары цягнуць прычэпы поўныя бульбы.

З тым жа запалам, як і хлebаробы вёскі, працуюць на ўборцы «другога хлеба» і студэнты фізічнага факультэта.

— Працаваць, дык на поўную сілу. Калі інакш, — гэта будзе не работа, а збор бульбы па прымушэнню, — гавораць камандзір і камісар атрада Лёня Сазанаў і Дзіма Маргаеў.

І каб у гэтым пераканацца, лепш за ўсё паглядзець іх запісы ў дзённіку:

«11 верасня. Першы дзень работы. Сабралі 32 тоны бульбы. Норму выканалі амаль на 160 працэнтаў».

«12 верасня. Цэлы дзень ішоў дождж, але, не звяртаючы на гэта ўвагі, працавалі. Норму выканалі».

У наступны дзень быў зноў рэкорд. Да 12 гадзін дня сабралі 16 тон бульбы.

— Мы вельмі задаволены працай студэнтаў, — гаворыць старшыня калгаса. — Уборка вядзецца без затрымкі, у любое надвор'е. Адразу відаць, што прыехалі яны з сур'ёзным намерам. І нам вельмі прыемна, што ў нас такія старанныя і руплівыя памочнікі.

— У мяне таксама няма заўваг. Дагавор, заключаны з намі, рабяты выконваюць паспяхова,— падтрымлівае сакратар партыйнай арганізацыі калгаса В. Д. Шувалаў.

Вядома, першарадная задача студэнтаў — дапамагчы гаспадарцы выкапаць бульбу. Але яны прывезлі з сабой у вёску і песні, і жарты, і вясёлы настрой — усё тое, без чаго немагчыма ўявіць студэнцкае жыццё.

З першага ж дня юнакі і дзяўчаты пасябравалі з мясцовай моладдзю. Пазнаёмілі сельскіх жыхароў з гісторыяй і традыцыямі адной са старэйшых ВНУ рэспублікі — Беларускага дзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, са сваім факультэтам.

**Н. КАСПЯРОВІЧ,**
**наш спец. кар.**

Уздзенскі раён.



## АПОШНІ

**Вакзал. Гудкі цеплавозаў. Мітусня. Студэнты. У першыя вераснёўскія дні іх тут асабліва шмат. Пачынаецца сельгасработа... Для каго першая, для каго апошняя. Сваёй непаўторнасцю, працай на калгасных палетках, нейкай шчымлівай восеньскай самотнасцю назаўсёды застаюцца ў памяці гэтыя, на першы погляд зусім звычайныя, паездкі.**

**Вось-вось кранецца цягнік. Развітальны ўзмах рукі і — бывай Мінск. На гэты раз дарогі прывялі на Магілёўшчыну. Менавіта тут працуюць звыш чатырох тысяч студэнтаў і выкладчыкаў БДУ.**

**Пачаліся будні. Незвычайныя сваёй звычайнасцю. І зноў студэнты паказваюць узоры ўдарнай працы. Ды і як працаваць горш, калі нас сустракалі з музыкай і кветкамі, як доўгачаканых гасцей. Але студэнты адчуваюць сябе зусім не гасцямі, а сапраўднымі гаспадарамі. Каб упэўніцца ў гэтым, варта зазірнуць на палі ці зернетакі. І студэнты не будуць студэнтамі, калі стрымаюцца ад песень і дасціпных жартаў. Прычым гэта ніколькі не перашкаджае ім ставіць працоўныя рэкорды, ад якіх звыклыя да**



# КЛОПАТ СТУДЭНТАЎ!

## Дзейнічае агітбрыгада

Пасля мітынгу, на якім прадстаўнікі Шклоўскага раёна віталі памочнікаў, што прыехалі з Мінска дапамагаць убіраць ураджай-79, студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі БДУ імя У. І. Леніна размеркавалі ў 15 гаспадарак раёна. На жаль, у мясцовых калгасах і саўгасах амаль няма магчымасці размясціць байцоў студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў разам, як гэта звычайна практыкуецца ў СБА. Таму юнакі і дзяўчаты з аднаго атрада жывуць у розных вёсках і працуюць у розных брыгадах, што, зразумела, перашкаджае дакладна наладзіць унутрыатрадную работу.

І толькі адзін з лепшых факультэцкіх ССГА мінулага года, атрад чацвёртакурснікаў «Салярыс», які працуе ў калгасе імя У. І. Леніна, здолеў арганізаваць жыццё і адпачынак па тыпу СБА. Студэнты афармілі наглядную агітацыю, арганізавалі ўрачыстае адкрыццё лагера. Кожны дзень яны выконваюць норму працы.

У калгасе «Бальшавік» працуе студэнцкі атрад, у састаў якога ўвайшла ў поўным складзе факультэцкая агітбрыгада, разам з яе кіраўніком малодшым навуковым супрацоўнікам У. Сечка. Самадзейныя артысты выступілі ўжо з двума канцэртамі перад сельскімі працаўнікамі і плануюць правесці рэйд па гаспадарках раёна.

**В. КРАСНАПРОШЫН,**
**сакратар партбюро ФПМ.**
Шклоўскі раён.

## «Чакалі з нецярплівасцю»,

**— ГАВАРЫЛІ Ў ВЁСЦЫ СТУДЭНТАМ СЕЛЬГАСАТРАДА «КРЫШТАЛЬ» ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ імя У. І. ЛЕНІНА**

— Ніхто і не думаў,— расказвае камісар Ірына Луніна, — што сёлета мы зноў будзем працаваць на уборцы бульбы ў Глухскай Сялібе. Сустракалі нас хлебам-соллю. Гучалі песні, музыка. У тую ўрачыстую хвіліну кожны з нас хацеў ведаць, у якую гаспадарку трапіць. Байцы атрада былі настроены працаваць з энтузіязмам. Бачым, усміхаецца нам вельмі знаёмы чалавек. Аказваецца, гэта быў прадстаўнік эксперыментальнай базы «Быхаўская», дзе наш сельгасатрад працаваў летась. Нібы па камандзе ўсе хуценька селі ў машыну. Па радасных тварах можна было зразумець: хлопцы і дзяўчаты задаволены.

— У атрадзе «Крышталь» 22 чалавекі — студэнты чацвёртага курса з кафедры фізікі цвёрдага цела.

У першы дзень адбыўся сход. Выбраць 60 гектараў бульбы — такое абавязацельства ўзялі ў трэцім працоўным семестры байцы «Крышталя».

— А ці справімся? — запытаўся на сходзе кіраўнік атрада выкладчык Валерый Міхайлавіч Драко. — Такі аб'ём работы можна выканаць толькі на бульбаўборачных камбайнах.

— Яно так, — адазваўся нехта з байцоў. — Будзем старацца...

Па-ўдарнаму працуюць на камбайне Ігар Елін і Аляксандр Абраменкаў.

— Норма выканана, — такімі словамі сустрэлі нас хлопцы ў час абедзеннага перапынку. — Да вечара спадзяёмся даць яшчэ адну норму.

— Малайцы, — шчыра дзякаваў студэнтаў дырэктар эксперыментальнай базы Е. А. Макаранка. — Слова цвёрда трымаеце.

У той дзень, калі мы былі ў атрадзе, было ўжо накапана каля 200 тон бульбы. І калі ўлічыць, што частка байцоў працавала яшчэ на збожжавым таку, то паказчык — высокі.

— Але ён мог быць яшчэ вышэйшым, — зазначае Ірына Луніна. — Як? Ды вось былі нядаўна дождж і мы вымушаны былі прастойваць. Справа ў тым, што бульбаўборачныя камбайны трэба абсталяваць з улікам кліматычных умоў. Напрыклад, абцягнуць поліэтыленавай плёнкай.

Байцы атрада неаднаразова напаміналі аб гэтым брыгадзіру М. І. Пархамовічу. А той толькі плячыма паціскае. Маўляў, ёсць жа начальства. Да дырэктара раіў звярнуцца.

Стоп. Няўжо з усімі просьбамі студэнты павінны звяртацца толькі да дырэктара? А што зрабіў сам брыгадзір? Ён жа бліжэй знаходзіцца да студэнтаў. Яму лепш відаць, што трэба зрабіць. У дадзеным выпадку брыгадзір М. І. Пархамовіч хаваецца за плячыма дырэктара, хаця і з кіраўніка, вядома, не здымаецца адказнасць.

Відаць, кіраўнікам эксперыментальнай базы «Быхаўская» ўжо настаў час падумаць аб гэтым неадкладна. На першы погляд поліэтыленавая плёнка над камбайнам — «дробязь». Але яна дае магчымасць працаваць нават у дрэннае надвор'е, а значыць — павысіць выпрацоўку. Вось тады словы «мы вас чакалі з нецярплівасцю» лагічна дапаўняюцца «...і падрыхтаваліся як след да прыёму студэнтаў».

**М. ФЕДАРЭНКА,**
**наш спец. кар.**
Быхаўскі раён.

## АКОРД ПРАЦОЎНАГА...

ўсяго калгаснікі ў здзіўленні разводзяць рукамі. І ад таго так весела Таццяне Касуха і Галіне Прыходзька. Хоць і цяж-... даць паўтары нормы ў ...ень, затое якое задавальненне ад выкананай работы.

«Сельгасработа» — паняцце шырокае. Не толькі ў полі можна ўбачыць студэнтаў. Праца ідзе і ў клубе, дзе рыхтуецца чарговы канцэрт мастацкай самадзейнасці, і ў школе па аказанню шэфскай дапамогі, здабываюцца новыя матэрыялы ў ходзе аперацыі «Памяць». Сумаваць няма калі. І зараз здаецца, што першае засмучэнне прыйдзе тады, калі ўжо не трэба будзе ехаць на сельгасработы з вясёлай групай сяброў-студэнтаў, а атрымаўшы новенькі дыплом, скажам: «Бывай, альма матэр».

**М. ДУБОВІК.**
Фота **аўтара.**





## ДАЕШ ПАЎТАРЫ НОРМЫ!

...У калгасе «Нёман» Уздзенскага раёна Мінскай вобласці засеяна бульбай 253 гектары. У сацыялістычных абавязацельствах гаспадаркі запісана: атрымаць з кожнага гектара па 290 цэнтнераў і прадаць дзяржаве 10400 цэнтнераў клубняў.

За лёс ураджаю хвалююцца не толькі хлебаробы, але і вучні школ, студэнты, рабочыя прамысловых прадпрыемстваў, якія зараз працуюць на бульбяных палях. І ад таго, як яны будуць працаваць, у значнай меры залежыць выкананне гаспадаркай намечанага задання.

Працоўны дзень для байцоў сельскагаспадарчага атрада «Іскра» трэцяга курса факультэта журналістыкі пачынаецца рана. Аб заданні на новы дзень паведамляе байцам камандзір атрада Уладзімір Прачуханаў, які ўзначальвае атрад ужо трэці год.

Высокія абавязацельствы ўзялі студэнты: накапаць 300 тон бульбы. Першы працоўны тыдзень паказаў, што намечаны рубеж будзе выкананы. За 10 працоўных дзён на рахунку журналістаў звыш 200 тон накапаных клубняў. Штодзённая норма выпрацоўкі складае 140—150 працэнтаў, або 1500—1700 кг на кожнага байца атрада. За выдатную работу праўленне калгаса «Нёман» ужо ўзнагародзіла студэнтаў грашовай прэміяй.

Пачуццё калектывізму, таварыства, узаемаразумення, адказнасці адзін перад адным — вось далёка не поўны пералік тых якасцей, якімі характарызуецца кожны працоўны дзень атрада. Студэнты добра разумеюць, як патрэбны рабочыя рукі ў гэтую пару. Таму старанна выконваць і значна перавыконваць дзённыя заданні. А ў баявых лістках ужо з'явіліся імёны лідэраў. Гэта Л. Бычкоўская, Л. Ванюшкіна, І. Емельяновіч, Т. Іўкіна, Т. Лазоўская, У. Стрэльскі, А. Рэбкавец і іншыя.

Вечарамі мясцовы клуб вёскі Касцяшы запаўняюць студэнцкія галасы. Рэдкалегія выпускае «маланкі» і баявыя лісткі. Да нашых паслуг свежыя газеты, часопісы, шашкі, шахматы, даміно. Можна паглядзець цікавую тэлеперадачу, патанцаваць або проста паслухаць музыку.

Цікавых спраў шмат. Галоўнае — усё зрабіць так, каб потым з поўным правам можна было сказаць: «працоўны семестр вытрыманы на выдатна».

І журналісты гэтае права заваёўваюць старанней працай. Інакш нельга. Бо ўжо родным стала для нас гэтае шырокае калгаснае поле, на якое прынеслі мы свае працоўнае натхненне і цеплыню камсамольскіх сэрцаў.

**Л. ЖЫЛІНСКАЯ,**
**студэнтка журфака.**

## Смела і рашуча

**ЎСТУПІЛІ Ў БОЙ З АГНЁМ СТУДЭНТЫ ФІЗФАКА**

Валерый Ханько, Ігар Елін, Анатоль Цупікаў і Валерый Цароў — сябры. Усе яны займаюцца на кафедры цвёрдага цела. Сёлетняя «бульба» ў іх — чацвёртая. І запомніцца яна ім надоўга...

Працоўны дзень набліжаўся да абедзеннага перапынку. На зернетаку, дзе працавалі хлопцы, заставалася зусім мала работы. Трэба было разгрузіць апошнюю машыну з мяшкамі, а потым — паднясць іх на другі паверх, каб высыпаць зерне ў сушылку. Задача не складаная, але патрабуе вялікай увагі і асцярожнасці. Валерый Цароў прывычным рухам націснуў кнопку электрапад'ёмніка, і некалькі мяшкоў асцярожна папплылі ўверх. Калі яны параўняліся з люкам, каля якога стаяў Валерый Ханько, пачулася каманда:

— Хопіць! Трэба здымаць! Але... Матор працягваў працаваць. Валерый Цароў не разгубіўся, і яшчэ некалькі разоў паспрабаваў выключыць пад'ёмнік. Не атрымалася. Вышлаў са строю магнітны пускальнік.

І тут здарылася тое, чаго ніхто не чакаў... Ад вялікага напружання ўспыхнула электраправодка. Чорны, горкі дым запоўніў усё навокал. Пачало тлець зерне...

Першым прыняў правільнае рашэнне Анатоль Цупікаў. Ён імкліва падбег да шчыта, дзе размяшчаўся электрычны рубільнік, і адключыў напружанне ад усяго пад'ёмніка. Цяпер можна было, не звяртаючы ўвагі на электраправодку, тушыць агонь. Дружная чацвёрка змагла хутка збіць полымя мяшкамі, ліквідаваць небяспеку, выратаваць зерне.

А вечарам з'явілася ў атрадзе «маланка»: «За тушэнне пажару на зернетаку брыгадзе хлопцаў аб'яўляецца ўдзячнасць!».

**С. ЛЫСКАВЕЦ,**
**наш спец. кар.**
Быхаўскі раён.

● ЗАПРАШАЕ ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

# ТУРБОТЫ АГУЛЬНЫЯ

**У Пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў» звяртаецца асаблівая ўвага на паляпшэнне якасці прафесіянальнай падрыхтоўкі і ідэйна-палітычнага выхавання кадраў, умацаванне сувязі з вытворчасцю, практыкай камуністычнага будаўніцтва.**

**У сувязі з гэтым значна ўзрастае роля падрыхтоўчага аддзялення нашага універсітэта, якое значна садзейнічае якаснаму набору будучых студэнтаў. Сёння мы прапануем чытачам артыкул загадчыка падрыхтоўчага аддзялення А. Г. Слукі.**

У сувязі з правядзеннем Алімпійскіх гульняў у 1980 годзе рашэннем дырэктыўных органаў скарочаны тэрмін прыёму на падрыхтоўчыя аддзяленні мінскіх ВНУ, у тым ліку і нашага універсітэта на 1979/80 навучальны год. Прыём заяў праводзіцца з 20 верасня, пачатак заняткаў — 1 лістапада.

Гэта стварае дадатковыя цяжкасці ў камплектаванні падрыхтоўчага аддзялення. У сціслыя тэрміны неабходна разгарнуць шырокую агітацыю сярод моладзі прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, у воінскіх часцях, на усёй тэрыторыі рэспублікі, каб стварыць конкурс па ўсіх спецыяльнасцях і адабраць найбольш падрыхтаваных юнакоў і дзяўчат.

Зрабіць гэта можна толькі ў тым выпадку, калі адборам слухачоў актыўна зоймуцца на факультэтах. Па рэкамендацыі рэктарата на кожным факультэце павінна быць створана спецыяльная група з выкладчыкаў, аспірантаў, камсамольскіх актывістаў, байцоў будаўнічых атрадаў з мэтай растлумачвання правілаў прыёму на падрыхтоўчае аддзяленне універсітэта сярод маладых рабочых мінскіх прадпрыемстваў, распаўсюджання агітацыйных матэрыялаў аб універсітэце і падрыхтоўчым аддзяленні. Члены такіх груп павінны выехаць у камандзіроўкі ў аддаленыя раёны рэспублікі для канкрэтнай работы сярод моладзі і весці размову не толькі аб сваім факультэце, але і аб універсітэце ўвогуле.

Асабліва складаная задача стаіць перад прыродазнаўчымі факультэтамі, на якіх план прыёму на падрыхтоўчае аддзяленне адносна вялікі (механіка-матэматычны—40, ФПМ-35, хімічны — 26, біялагічны — 23, фізічны—28), а конкурс, як паказалі мінулыя гады, заўсёды недастатковы для якаснага адбору маладых людзей. Тут патрэбна выкарыстоўваць усе магчымасці, каб укамплектаваць падрыхтоўчае аддзяленне, апраўдаць вялікія маральныя і матэрыяльныя затраты. Правільна паступіў дэканат факультэта прыкладной матэматыкі, які стварыў групу садзейнічання прыёму на падрыхтоўчае аддзяленне з 20 чалавек. Калі яна зможа правільна арганізаваць сваю працу, станоўчыя вынікі будуць абавязкова.

Ва універсітэце ўжо шмат зроблена, каб паспяхова правесці прыём на падрыхтоўчае аддзяленне. Падрыхтавана і распаўсюджана вялікая колькасць азнаямленча-агітацыйнага матэрыялу. Студэнцкія будаўнічыя атрады ў час летніх канікулаў правялі неабходную работу сярод моладзі на месцах дыслакацыі будатрадаў. Цяпер такая магчымасць прадастаўлена тым студэнтам і выкладчыкам, што працуюць на ўборцы ўраджаю.

Дарэчы, патрэбна мець на ўвазе той факт, што заняткі на падрыхтоўчым аддзяленні пачынаюцца ў гэтым годзе роўна на месяц раней. Такім чынам, дэмабілізаваныя з радоў Савецкай Арміі ў большасці сваёй будуць спазняцца да паступлення амаль на тры месяцы. А так як з арміі прыходзіць заўсёды амаль палова слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, патрэбна ў адпаведнасці з гэтым павялічыць намаганні, каб адшукаць дадатковыя рэзервы моладзі, маючай права паступаць і вучыцца на аддзяленні.

Таму разам з традыцыйнымі формамі і метадамі адбору моладзі на падрыхтоўчае аддзяленне, ад факультэтаў патрабуецца работа з канкрэтнымі людзьмі. Патрэбна прыкласці ўсе намаганні да таго, каб да часу субяседавання мы мелі ўстойлівы кантынгент кандыдатаў у слухачы падрыхтоўчага аддзялення, каб кожная гутарка на прадпрыемстве, камандзіроўкі ў калгас або саўгас мелі больш поўную аддачу, далі канкрэтныя адрасы маладых людзей, якія змогуць паспяхова вучыцца на аддзяленні, а затым і ва універсітэце.

Задача гэта складаная, але разам з тым вельмі важная і пачэсная. У гэтым годзе на аддзяленні будзе вучыцца 350 юнакоў і дзяўчат, амаль 20 працэнтаў ад колькасці студэнтаў-першакурснікаў. Зразумела, што ад таго, як паспяхова будзе праведзены набор на падрыхтоўчае аддзяленне, у многім залежыць фарміраванне універсітэцкага кантынгенту студэнтаў.

Усіх тых, хто займаецца арганізацыяй прыёму на падрыхтоўчае аддзяленне, трэба папярэдзіць аб адной важнай акалічнасці — больш настойліва і патрабавальна звяртацца да кіраўнікоў прадпрыемстваў, партыйных і камсамольскіх работнікаў, адказных за падбор і накіраванне передавых рабочых на вучобу ва універсітэт.

ЗНАЁМЦЕСЯ: НАШЫ СЯБРЫ

# *Адрас дружбы—БДУ*



*Нядаўна ў Мінску закончыўся тыдзень савецка-в'етнамскай дружбы, прысвечаны нацыянальнаму святу Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам — 34-й гадавіне жнівеньскай рэвалюцыі.*

*Вечары, сходы, лекцыі і даклады, сустрэчы з в'етнамскімі сябрамі — такой была праграма Дзён СРВ у БССР. Актыўны ўдзел ва ўрачыстасцях прымала і в'етнамскае зямляцтва, у склад якога ўваходзяць выхаванцы БДУ імя У. І. Леніна. Двух з іх мы прадстаўляем сёння на нашых старонках.*

Вось і зноў восень. Халодны вецер разносіць пажухлае лісце, накрапвае дождж. Здаецца, гэта было так нядаўна, калі ўпершыню прыехаў у Савецкі Саюз, у Беларусь. І вось мінула пяць гадоў. Пяць гадоў вучобы, знаёмстваў, сапраўднага сяброўства.

— У Мінск я прыехаў з невялікай в'етнамскай правінцыі Тхінь Хаа,— гаворыць Ле Туан Хаа.— Там я вучыўся, там засталіся мае бацькі і сябры. Ведаеце, спачатку было неяк адзінока. Вельмі сумаваў па Радзіме, хаця і пісьмы адтуль часта прыходзілі. Але потым, калі стаў займацца на механіка-матэматычным факультэце універсітэта, у мяне з'явілася шмат сяброў. Я пазнаёміўся з цудоўнымі савецкімі рабятамі, дабрата, шчырасць і сумленнасць якіх — галоўныя якасці. Яны заўсёды дапамагалі мне, падказвалі, тлумачылі, калі было незразумела.

Першыя гады вучобы — самыя цяжкія, бо прыходзіцца прывыкаць да новых умоў, людзей, новых традыцый і звычак, вывучаць рускую мову. Як неабходна ў такі момант побач плячо сапраўднага таварыша!

— Такім сябрам стаў для мяне Віктар Кучынскі. Мы з ім разам ужо пяты год вучымся на мехмаце, дапамагаем адзін аднаму, разам пражылі два гады ў адным пакоі ў інтэрнаце. Так што сумаваць мне не было калі.

Матэматыку Ле Туан Хаа палюбіў яшчэ ў школе, таму вырашыў працягваць вучобу ў ВНУ іменна па гэтай спецыяльнасці. Вучоба не выклікае ў яго складанасцей. У залікоўцы в'етнамскага хлопца— толькі пяцёркі і чацвёркі.

Але не толькі лекцыі, канспекты, падручнікі займаюць увесь час студэнта. Ужо каторы год Ле Туан Хаа — член савета в'етнамскага зямляцтва: ён адказны за вучобу. Прыходзіцца сачыць і за паспяховасцю, і за наведваннем заняткаў в'етнамскімі студэнтамі, разам з членамі зямляцтва арганізоўваць дасуг рабят.

Гэтым летам Ле Туан Хаа ездзіў у Маскву да свайго сябра-аднакласніка, які таксама займаецца ў ВНУ. Рабяты пазнаёміліся са славутасцямі сталіцы СССР, асабліва запомніўся хлопцу Крэмль. Некалькі разоў наведаў Маўзалей вялікага Леніна. Пазней, з групай студэнтаў пабываў на Кургане Славы, у Хатыні.

— Вельмі ўразіла мяне Хатынь. Нагадвае маю абпаленую вайной Радзіму. Майму В'етнаму таксама многа давялося перажыць...

Так, краіна перанесла многа. Цяпер ёй, як ніколі, патрэбны высокакваліфікаваныя спецыялісты. В'етнамскія студэнты добра разумеюць гэта і ставяцца да вучобы з усёй сур'ёзнасцю. Тым больш, што ва універсітэце база для гэтага вельмі трывалая. Найбольш здольныя з рабят могуць працягваць вучобу і далей. Фам Ву Тхінь, напрыклад, ужо скончыў фізічны факультэт БДУ і зараз займаецца ў аспірантуры на кафедры агульнай фізікі.

— Ці цяжка давалася вучоба?

— У асноўным, не. Калі што не атрымлівалася, адразу ж мне на дапамогу прыходзілі савецкія сябры. Як толькі прыехаў у Мінск, я не ведаў ніводнага слова па-руску. А зараз руская мова стала для мяне амаль роднай.

Фам Ву Тхінь — старшыня в'етнамскага зямляцтва, таму спраў у яго хапае: каб жыццё в'етнамскіх студэнтаў было цікавым і насычаным, каб рабяты адчувалі сябе як дома, савету зямляцтва неабходна вырашыць пытанні аб арганізацыі вечароў, правядзенні спартыўных мерапрыемстваў, канцэртаў мастацкай самадзейнасці, палітзаняткаў.

— Даўняя дружба звязвае нас з шэфамі — працоўнымі камвольнага камбіната. Канцэрты, выступленні, сустрэчы— усё гэта ўваходзіць у праграму трохбаковага дагавора, заключанага паміж в'етнамскім зямляцтвам, камітэтам камсамола БДУ і камвольным камбінатам. У сваю чаргу шэфы стараюцца дапамагаць зямляцтву, нядаўна яны прапанавалі нам правесці сумесны суботнік, а грошы, заробленыя на ім, перадаць у фонд В'етнама,—гаворыць Фам Ву Тхінь.

...Хутка прыйдзе час, калі трэба будзе в'етнамскім рабятам — ужо маладым спецыялістам — развітвацца з палюбіўшымся ім горадам, са стаўшым родным універсітэтам, з цудоўным паркам над Свіслаччу. Але ніколі не забудуцца прыветлівыя сяброўскія ўсмешкі, шчырасць і дабрата савецкіх юнакоў і дзяўчат. І доўга яшчэ будуць прыходзіць у Мінск з В'етнама пісьмы са словамі: «Добры дзень, мой савецкі сябар!..»

І. САВЕТКІНА.



**Пасля заканчэння нашага універсітэта лепшыя студэнты з СРВ застаюцца працягваць адукацыю ў аспірантуры пры БДУ.**

**НА ЗДЫМКУ: аспірант кафедры тэорыі функцый Ле Хыу Зьен пасля абароны сваёй кандыдацкай работы з загадчыкам кафедры прафесарам Э. І. Звяровічам.**

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

● МАСТАЦТВА

# У творчым пошуку

У апошні дзень жніўня нашы першакурснікі пасля пасвячэння ў студэнты былі запрошаны ў актавы зал універсітэта. Мастацкая частка свята ў гэтым годзе была нетрадыцыйнай. Перад прысутнымі выступілі кіраўнікі чатырох народных калектываў мастацкай самадзейнасці універсітэта. Яны расказалі аб гісторыі стварэння і планах работы ансамбля народнага танца «Крыжачок», аркестра народных інструментаў, харавой універсітэцкай капэлы, студэнцкага тэатра. Паказалі фрагменты з фільма аб БДУ і слайды аб мастацкіх паездках і канцэртах калектываў, запрасілі ў свае рады новае папаўненне.

Наш старэйшы самадзейны калектыў, народны ансамбль народнага танца «Крыжачок», кіруе якім заслужаны работнік культуры БССР М. В. Лапша, зараз рыхтуецца да гастрольнай паездкі ў складзе савецкай дэлегацыі ў Аўстралію, Новую Зеландыю, астравы Фіджы для ўдзелу ў правядзенні там Дзён культуры СССР.

Працягваюцца рэпетыцыі народнага аркестра народных інструментаў. М. А. Лісіцын, заслужаны работнік культуры БССР, рыхтуе сваіх пітомцаў да паездкі з канцэртам у Сафійскі універсітэт імя К. Ахрыдскага, абмен калектывамі мастацкай самадзейнасці з якім запланаваны ў рамках сумеснага дагавора аб супрацоўніцтве.

Абнаўляе свой рэпертуар народная харавая капэла БДУ, да работы з якой нядаўна прыступіў новы кіраўнік, выпускнік Белдзяржфілармоніі А. Г. Собалеў. Капэла зараз рыхтуецца да ўдзелу ў конкурсе «Ювентус-79», які адбудзецца 25 лістапада ў Каўнасе.

Перыяд творчых пошукаў перажывае і народны студэнцкі тэатр. Калектыў яго працуе над састаўленнем новага рэпертуару.

**М. СІЛІН,**
**мастацкі кіраўнік клуба БДУ.**


**Беларускі універсітэт**

**20 ВЕРАСНЯ 1979 г.**

**Заказ № 1424. АТ 10832**

**220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.**

**ТЭЛЕФОН 22-07-19**

**В. а. рэдактара**
**В. П. ВАРАБ'ЁЎ**

**Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.**